Гомельская вобласць, Гомельскі раён

Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Маркавіцкі дзіцячы сад-сярэдняя школа”

**Абласны конкурс “Звычаі, традыцыі і абрады сваёй мясцовасці”**

**Намінацыя: народныя абрады**
**ў адпаведнасці з календаром**

# “Каляндарныя святы і абрады вёскі Маркавічы і наваколля”


Выканалі: Карэба Вікторыя,
Пятрэнка Іна
вучаніцы 11 класа
ДУА “Маркавіцкі дзіцячы
сад-сярэдняя школа”

Кіраўнікі: М.А. Герасенка
настаўнік геаграфіі
ДУА “Маркавіцкі дзіцячы
сад-сярэдняя школа”,
Р.Ц. Басаў
кіраўнік фальклорнага
клуба “Спадчына”
ДУА “Маркавіцкі дзіцячы
сад-сярэдняя школа”


Маркавічы, 2012

**Змест**

Уводзіны ........ 3

Месца даследавання ........ 4

Каляндарныя святы і абрады в. Маркавічы і наваколля. ........ 6

Зімовыя святы ........ 6

Вясновыя святы ........ 10

Летнія святы ........ 13

Асеннія святы ........ 18

Сучаснае бытаванне каляндарных свят і абрадаў ........ 21

Заключэнне ........ 24

Літаратура ........ 25

Дадатак 1. Спіс інфарматараў. ........ 26

Дадатак 2. Зімовыя абрады. “Звязда”. Шчадроўныя песні ........ 27

Дадатак 3. Вясеннія абрады “Гуканне вясны”, “Сула”, валачобныя песні ........ 36

Дадатак 4. Летнія абрады. “Ваджэнне русалкі”. Жніўныя песні. ........ 48

Дадатак 5. Хрысціянскія святы. “Свяча” ........ 52

Дадатак 6. Каляндар народных свят і абрадаў в. Маркавічы і наваколля ........ 56

Анатацыя ........ 59

# Уводзіны

Народная культура – найважнейшая частка нашай гісторыка-культурнай спадчыны. Яна адыграла выключную ролю ў самазахаванні беларусаў як этнасу, адлюстроўваючы яго гістарычныя вытокі і першародную сутнасць. Складваючыся з цягам часу ў зладжаную і гарманічную сістэму жыццёвых правіл, маральных норм, звычаяў, абрадаў, духоўных светапоглядаў, міфалагічных і мастацкіх вобразаў, працоўных навыкаў, народныя традыцыі служылі магутнай ахоўна-маральнай сілай, інтэлектуальным рэсурсам, што вызначаў жыццяздольнасць народа і яго самабытнай культуры.

Менавіта народная культура з уласцівымі ёй першароднай чысцінёй, глыбокай маральнасцю, рэгіянальнай разнастайнасцю ажыццяўляе розныя віды прафесійнага мастацтва, надае ім непаўторны каларыт і супрацьстаіць агрэсіі масавай, безыдэйнай і казённай выпусташанай культуры.

Адной з важнейшых складаючых народнай спадчыны з’яўляецца фальклор – самы багаты і разнастайны па зместу і мастацкай форме раздзел народнай творчасці. Ён у паэтычнай форме адлюстроўвае погляды народа на навакольную рэчаіснасць, выражае яго пачуцці, надзеі, уяўленні. Фальклорныя традыцыі маюць агульнанацыянальнае значэнне, валодаюць духоўнай, маральна-эстэтычнай непаўторнасцю, уяўляе арыгінальную сістэму жыццезабеспячэння людзей. Свята, абрад, род – гэтыя словы зараз, на жаль, губляюць сваё значэнне. Пад уплывам часу нашчадкі забываюць непаўторныя і самабытныя традыцыі сваіх продкаў, зараз адбываецца адыход старэйшага пакалення вяскоўцаў-носьбітаў і зберагальнікаў скарбаў народнай культуры. Таму захаванне гэтага вялікага пласту культуры – адна з важнейшых задач сучаснай фалькларыстыкі.

Найбольш актуальным у наш час становіцца вывучэнне лакальных і рэгіянальных асаблівасцей фальклору, што неабходна для рэалізацыі ў культурнай палітыцы нашай краіны палажэнняў Міжнароднай канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай спадчыны, да якой Беларусь далучылася ў 2004 годзе. Рэгіянальнае і лакальнае вывучэнне фальклору дазваляе стварыць цэласную карціну яго стану і бытавання, зрабіць адпаведныя абагульненні. Без гэтага нельга атрымаць поўную характарыстыку фальклорна-этнаграфічных традыцый у цэлым на тэрыторыі краіны, іх сучаснага стану, выявіць як мясцовыя, так і рэгіянальныя асаблівасці.

Сістэматызаванае даследаванне каляндарна-абрадавага фальклору Гомельшчыны, разнастайнасці яго рэгіянальна-лакальных форм яшчэ не праведзена, шматлікія варыянты некаторых жанраў недастаткова зафіксаваны і асэнсаваны.

Трэба ўлічваць, што носьбітамі народных традыцый з’яўляюцца людзі састарэлага ўзросту, якіх застаецца ўсё менш і менш, што павінна турбаваць кожнага. Таму будзе недаравальна, калі на нашым пакаленні згубіцца шматвекавая народная культура, знікнуць традыцыйныя народныя святы. У

сувязі з гэтым надзвычай важным з’яўляецца даследаванне фальклорна-этнаграфічных звестак пра абрады, звычаі ў кожным рэгіёне Гомельшчыны.

**Мэта работы:** даследаванне асаблівасцей каляндарных свят і абрадаў паўднёвага ўсходу Гомельскага раёна, захаванне і адраджэнне фальклорнай спадчыны Гомельшчыны.

**Задачы:**

- сабраць і сістэматызаваць матэрыял аб народных святах і абрадах мясцовасці;
- вызначыць язычніцкія і хрысціянскія вытокі народных свят і абрадаў;
- выявіць лакальныя асаблівасці каляндарных свят рэгіёна;
- стварыць каляндар “Народныя святы і абрады вёскі Маркавічы і наваколля”.

## Месца даследавання

Даследаванні праводзіліся ў в. Маркавічы і навакольных вёсках, якія уваходзяць у склад Маркавіцкага сельскага савета. Гэта Гадзічава, Глыбоцкае, Паддабранка, п. Рагі-Ілецкі. Вывучаемая тэрыторыя размешчана ў паўднёва-ўсходняй частцы Гомельскага раёна, на поўдні яна мяжуе з Рэпкінскім раёнам Чарнігаўскай вобласці Украіны.




У гісторыка-этнаграфічным плане вывучаемая тэрыторыя адносіцца да Падняпроўя. З мінулага часу і да нашых дзён культура рэгіёна падвяргалася значнаму ўплыву ўкраінскага і рускага этнасаў.

Час узнікнення сельскіх пасяленняў розны - некаторыя вёскі, напрыклад, Маркавічы, узніклі да пачатку XVI ст., в. Гадзічава, Глыбоцкае ў XVII ст., а п. Рагі-Ілецкі ў канцы 20-х гадоў XX стагоддзя.

Асноўны занятак насельніцтва - сельская гаспадарка. У вёсках значная доля насельніцтва сталага ўзросту.

# Каляндарныя святы і абрады в. Маркавічы і наваколля.

## Зімовыя святы

На пачатак зімы прыходзіцца Піліпаўскі пост, які пачынаецца з 28 лістапада. У гэты час звычайна ткалі, вышывалі, займаліся рознымі дамашнімі справамі. Першым значным зімовым святам у нашай мясцовасці з’яўляецца **Кацярына** (Вялікамучаніца Кацярына),  якое адзначаецца **7 снежня**. Гэта прастольнае свята жыхароў вёскі Гадзічава, бо там знаходзіцца Свята-Кацярынінская царква. Прастольныя святы ў гонар святога, імя якога носіць царква ў нашых вёсках, называецца “храмок”. Пасля службы ў царкве ішлі, ехалі ў госці ў в. Гадзічава, а увечары адзначалася «Свяча». Збіраліся ў хаце, у якой захоўвалася ікона Вялікамучаніцы Кацярыны, правілі службу ў гонар яе, затым вячэралі.




Свята-Кацярынінская царква ў в. Гадзічава

**19 снежня** адзначалася свята **Міколы Зімняга**  (Мікалая  Цудатворцы). У царкве заўсёды адбываецца  служба. Мікалай Цудатворац вельмі шануемы святы ў нашай мясцовасці, таму у гэты дзень ніколі не працуюць.

Асаблівае месца сярод зімовых свят займаюць калядныя. Яны адзначаюцца ў пачатку каляндарнага году, у перыяд зімовага сонцазвароту, калі дзень пачынае павялічвацца. З гэтымі святамі нашы продкі звязвалі свае надзеі на шчаслівае жыццё ў будучым годзе, на багаты ўраджай і дабрабыт сям'і.

Пасля доўгага Піліпаўскага паста, які доўжыўся 6 тыдняў, наступае доўгачаканае **Ражаство Хрыстова**. Святкаванне пачыналася ўжо звечара 6 студзеня, хаця само свята адзначаецца **7 студзеня**. Напярэдадні ў хаце прыбіралі, уся сям'я мылася, рыхтавалі вячэру, асноўная ежа якой - посная куцця. Варылася гэта каша з ячменных круп з мёдам або цукрам. Ставілі яе на стол у чырвоны кут, пад настольнік лажылі сена. За стол садзіліся, калі з'яўлялася першая зорка. У гэтым адлюстроўваліся вядомыя хрысціянскія ўяўленні аб цудоўнай зорцы, якая абвясціла, што нарадзіўся Збавіцель Хрыстос. Калі заставалася куцця, яе давалі курам, каб несліся, а сена - карове, каб было больш малака.

Трэба адзначыць, што у нашай мясцовасці, як і паўсюдна на Гомельшчыне і Беларусі, народныя святы ўяўляюць сабой цеснае перапляценне язычніцкіх і хрысціянскіх свят. І найбольш яскрава гэта найшло адлюстраванне ў калядных святах. Захавалася язычніцкая традыцыя зваць Мароза ў госці, каб задобрыць яго. Калі сям'я садзілася за стол, гаспадар зваў Мароза: "Мароз, мароз, ідзі, ідзі куццю есці, а ўлетку не ідзі, а то будзем драцяной пугай біць", або "...у Пятроўку не ідзі, а то дадзім пугай". Каб несліся куры, дзеці залазілі пад стол і кудахталі.  Потым старэйшыя ішлі ў царкву. Пасля, раніцай, разгаўляліся, елі святочную скаромную ежу.

На **другі дзень Ражаства** насілі **"Звязду"**. Некалькі чалавек (часцей гурт моладзі) са "звяздой" - выработанай з драўляных палачак і ўпрыгожанай лентамі васьміканцовай зоркай, якая трымалася на палцы. У цэнтры "Звязды" устаўлялася ўпрыгожаная вянком ікона Ражаства.





"Звязда"

Са "Звяздой" хадзілі па хатах, чыталі вершы і песні аб нараджэнні Хрыста (дадатак 2).





"Звязда" ў в. Маркавічы, 2010-2011 г.г.

"Звязду" насілі да 13 студзеня, да Новага года. Звычайна было некалькі гуртоў моладзі, якія насілі зорку не толькі  ў в. Маркавічы і в. Гадзічава, але і па навакольных вёсках. Гэты абрад захаваўся да нашага часу.

З 7студзеня пачыналіся святкі - вечарамі забаранялася працаваць - шыць, вязаць, сціраць, ткаць. Моладзь хадзіла на вячоркі, спявалі, танцавалі. Святкі доўжыліся да **19 студзеня**, свята **Крашчэння**.  У іншых мясцовасцях Гомельшчыны былі пашыраны гульні, якія садзейнічалі выбару пары, будучаму шлюбу - "Жаніцьба Цярэшкі", "Жаніцьба Бахана", але ў нашай мясцовасці звестак аб гэтым не захавалася.

**13 студзеня**, напярэдадні старага Новага года і свята Васілія Вялікага (Васіля) гатавалі скаромную куццю ("багатую", "шчодрую"). Гэты вечар у нас называецца **Шчодрыкі**. Дзеці, моладзь і дарослыя хадзілі шчадраваць. Пасля абеду пачыналі шчадраваць дзеці, асноўная песня:

Шчодрык, петрык,
Дай варэнік,
Ложку кашкі,
Салца, каўбаскі.
Выносьце, добрыя людзі!



“Шчодрыкі”

Пазней, вечарам, дзяўчаты і жанчыны хадзілі шчадраваць і спявалі песні. Падыходзілі пад вакно і пыталіся: "Спець песню?" - "Спейце". Пасля гэтага выконваліся шчадроўныя песні (дадатак 2).

Захавалася нямала шчадроўных песень, прычым, адны песні поўнасцю язычніцкага паходжання, якія не зведалі моўнага хрысціянскага ўплыву, аб чым гаворыць прыпеў: "Шчодры вечар добрым людзям". Другія песні падвергліся пэўнай хрысціянізацыі, у іх прыпеў: "Святы вечар". У вёсцы Маркавічы была запісана песня аб царкве, падобная якой не сустракаецца ў фальклорных запісах абрадавай паэзіі Гомельскага раёна, у якой найбольш яскрава перапляліся язычніцкія і хрысціянскія традыцыі.

Вечарам таксама вадзілі мядзведзя, казу, перадзяваліся ў цыган. Хлопцы выварочвалі кажухі і былі мядзведзь і каза. Мядзведзь качаецца, каза танцуе. Каза ішла ў парог, брала вілкі, лезла вілкамі ў печ, даставала ежу. Цыганкі спявалі, варажылі, за тым пелі песні гаспадарам, якія іх частавалі.

У гэты ж вечар дзяўчаты варажылі аб будучым. Бралі святочную куццю ў рот і падслухвалі пад вокнамі. Калі ў хаце было ціха - то будуць добра жыць, а калі - лайка, то жыццё будзе дрэнным. Калі сустракалі мужчыну, то ў гэтым годзе павінны былі выйсці замуж. Кідалі праз вароты абутак: куды паляціць, у тое сяло і замуж пойдзе. Абдымалі плот: калі цотны лік дошак, то будзе ў пары, калі не - у гэтым годзе не выйдзе замуж. Замыкалі ваду: уносілі вядро з вадой ў сені, на дужку вядра вешалі замок, потым лажылі яго пад падушку, казалі : " Хто прыйдзе адмыкаць, з тым век векаваць". Уносілі абарэмак дроў: калі да пары - то выйдзе замуж. Паясы кідалі ў начоўкі і трусілі іх. Чый пояс зверху - тая першая пойдзе замуж. Закладалі сон. Уносілі вядро вады, налівалі ў стакан, папярок лажылі палачку, ставілі ля ложка, казалі: "З кім век векаваць, прыдзі, чэраз масток перавядзі" і лажыліся спаць.

Назаўтра, **14 студзеня**, на **Васіля**, з раніцы ішлі **засяваць**. Заходзілі ў хату, пыталі дазволу, сыпалі зерне і гаварылі:

"Сею, сею, засяваю,
З Новым годам паздраўляю".

18 студзеня, напярэдадні свята Хрышчэння была 3-я посная куцця. Як і напярэдадні Ражаства, не елі да першай зоркі. Увечары дзяўчаты варажылі. Уначы ішлі ў царкву, свяцілі ваду. **19 студзеня Святое Крашчэнне** (Хрышчэнне). У гэту ноч можна браць ваду з любой крыніцы, ракі, возера. У хрысціянскім свяце Крашчэння знайшлі адбітак старажытныя язычніцкія вераванні ў магію вады. Асвечаная вада, або вада, набраная на Крашчэнне, захоўваецца ўвесь год. Яе даюць піць хворым, апырскваюць хату, поле перад сяўбой, труну з нябожчыкам. 19 студзеня бацюшка хадзіў па хатах, ставіў над дзвярамі крыжык "Ердань". На гэтым заканчваліся калядныя святы ў нашай мясцовасці.

Акрамя калядных свят найбольш значнымі зімовымі святамі з'яўляецца Стрэчанне і Масляны тыдзень. **Стрэчанне** святкуецца **15 лютага**. У гэты дзень лічылася, што зіма сустракаецца з летам. Вызначалі надвор'е: калі на стрэчанне певень нап'ецца вады са страхі, то хутка наступіць вясна, будзе цёпла. 15 лютага хрысціяне адзначаюць свята Срэценне Госпада нашага Ісуса Хрыста, у царкве асвячаюцца свечкі ("грамнічныя", "грамовыя"). Гэтыя свечкі захоўваюцца ўвесь год, а калі граза, то іх запальваюць і моляцца, каб маланка не ўдарыла ў пабудовы, не забіла. Гэтай свечкай над дзвярамі выпальваюць крыж для аховы дома ад стыхій, нячыстай сілы.

Звычайна ў сярэдзіне-канцы лютага перад пачаткам Вялікага паста наступае **Маслены тыдзень**, напярэдадні якога адзначаецца Дзедава пятніца і субота. У царкву падавалі памінанне аб сваіх памерлых продках, а вечарам на стале астаўлялі ежу для "дзядоў". А з панядзелка пачынаўся масляны тыдзень. На гэтым тыдні ўжо не дазваляецца есці мяса, толькі малочнае. Наладжвалі гульні, пяклі бліны ("блінцы"), "вушкі". У в. Гадзічава інфарматары апісалі свята

**"Нараджэнне калодкі"**. Жанчыны збіраліся ў панядзелак у хаце адной з жанчын і адзначалі "нараджэнне калодкі", назаўтра ў другой хаце адзначалі "хрышчэнне" і г. д. да нядзелі, а ў нядзелю калодку хавалі. У моладзі была традыцыя "цяганне калодкі". Хлопцу, які доўга не жаніўся, дзяўчаты да нагі прывязвалі калодку, якую ён павінен быў цягаць за сабой. Хлопец адкупаўся, купляў дзяўчатам падарункі.





Завяршэнне Маслянага тыдня, в. Маркавічы

З панядзелка пачынаўся пост, але тыя мужчыны, якія напярэдадні добра адзначылі масленую нядзелю, у панядзелак з раніцы апахмяляліся. Таму гэты дзень яшчэ называлі "паласказуб". У нядзелю ішлі ў царкву, прасілі прабачэння адзін у другога, так як гэтая нядзеля Прошчаная.

Трэба адзначыць, што ў нашай мясцовасці не захавалася звестак аб выкарыстанні слова "Каляды", спальванні чучала зімы у апошні дзень Масленага тыдня.

## Вясновыя святы

Пачатак вясны таксама супадаў з пастом, гэта Вялікі пост. У гэты час адзначалася толькі сярэдзіна посту (3 тыдні), "сярэдзінахрэсная" - выпякалі посныя крыжыкі. **22 сакавіка** адзначаліся **Соракі** - хрысціянскае свята Сарака мучанікаў. У гэты дзень варажылі на трэсках, дровах, плоце, колькі вясной знойдзеш птушыных кублаў, сеялі расаду, варылі 40 варэнікаў.

Уласна веснавы цыкл пачынаўся з абрадавых песень - "вяснянак". У нашай мясцовасці пачыналі пець "вяснянкі" на Благавешчанне, якое адзначаецца 7 красавіка і пасля яго. Гэта вялікае хрысціянскае свята, у гэты дзень забаранялася любая работа, казалі "пціца гняздо не ўе, дзеўка косу не пляце". Гэта і свята прылёту бусла. Лічылася, калі ўбачыш бусла ў палёце, то будзе шчаслівы год, будзеш здаровы, "лёгкі на ногі". Дзеці, як толькі сходзіў снег, гулялі ў гарэпню (накшалт путаніцы), клёк, стукалку, скачок.

На **Благавешчанне, 7 красавіка**, заводзілі танок. Для гэтага расстаўлялі дзяцей і між імі вялі танок. Пачыналі пець "вяснянкі", гукаць вясну (дадатак 3).

Да Благавешчання забаранялася капаць зямлю. На думку некаторых даследчыкаў, гэта звязана з адгалоскамі свята змяі, яшчэ з палеаліту, гуканне вясны таксама звязваецца са святам маці – сырой зямлі (яе роды), якое адзначалася ў мезаліце. Зараз язычніцкія абрады выцесніліся хрысціянскімі традыцыямі.



Гуканне вясны, в. Маркавічы

Галоўнае веснавое свята – **Паска (Вялікдзень)**, за тыдзень якому папярэднічае Вербная нядзеля. У царкве асвячаюць галінкі вярбы, пасля чаго адзін другога, дзяцей сцябалі імі, прыгаворваючы: “Не я б’ю, вярба б’е, слухай матку, слухай бацьку і мяне слухай. Будзь здарова, як вада, багата, як зямля”. Гэтыя галінкі захоўваліся ў хаце ўвесь год.

Наступны тыдзень рыхтаваліся да галоўнага хрысціянскага свята – Паскі, вялікага гадавога свята, корні якога вядуць у глыбокую старажытнасць. Але асабліва вылучаецца “чысты чацвер”. У гэты дзень заканчвалі прыбіраць у хаце, мыліся. У пятніцу, суботу фарбавалі яйкі, пяклі святочныя пірагі – паскі. З чацвярга, звечара, не елі да Паскі.

Свята пачыналася з ўсяночнай – начной службы у царкве, дзе асвячалі яйкі і паскі. Рана раніцай глядзелі на узыход сонца, лічылася, што яно асабліва ўзыходзіць, “грае”. Пасля царквы прычашчаліся, елі скаромную ежу, але спярша свечанае яйка і паску, а пасля ўжо мясныя стравы. Днём дзеці, мужчыны, старыя гулялі “наўбіткі” – чыё яйка цвярдзейшае – “мацак”.

У вёсцы Маркавічы мужчыны гулялі ў “кружала”, якое напамінае сучасны барабан у гульні “Поле цудаў”. Круцілі круг, хто набіраў больш балаў, выігрываў яйка.

У першы дзень Паскі дзеці хадзілі па хросных, а тыя давалі яйкі, пірагі. Магчыма, гэта адгалоскі валачобнага абраду. Некаторыя інфарматары памятаюць, як дзеці з валачобнымі песнямі хадзілі па дварах, што сведчыць аб

існаванні валачобнага абраду ў нашай мясцовасці.

На другі дзень Паскі ў нашай мясцовасці (в. Глыбоцкае, Краўцоўка, Маркавічы, Гадзічава) вадзілі **“Сулу”**. Лічылася, што гэта садзейнічае ўраджаю агародніны, капусты. Назва, магчыма ад слова “сула” – вяртлявы, рухомы, непаседа. Напэўна, таму і некалькі рэк маюць такую назву – Сула, Сулак. Гэта свята аб’ядноўвае і язычніцкі абрад і найвялікшае свята хрысціян – Уваскрашэнне Хрыста (Паску).

Пачыналася “Сула” за в. Гадзічава. Збіралася многа людзей, ішлі з песнямі праз усю вёску, з кожнага дома выходзілі і далучаліся да людскога патоку. Потым ішлі да в. Маркавічы, а затым за вёскай гулялі, танцавалі, пелі.





“Сула” ў в. Маркавічы

“Сула” існавала ў нашай мясцовасці з даўніх часоў, а ў 60-я гады была забаронена мясцовымі ўладамі. Старшыня калгаса на кані гнаўся за жанчынамі, біў іх пугай. Але ўжо некалькі год, як свята зноў адноўлена і праводзіцца на базе Маркавіцкага дзіцячага сада-сярэдняй школы.

Праз тыдзень ад Паскі, у аўторак адзначаецца **Радуніца** (радуніцкія Дзяды). Карані гэтага свята ў першабытна-абшчынным ладзе, звязана з культам продкаў, памінаннем памерлых.

Вечарам у царкве памінаі памерлых родзічаў, а ў аўторак ішлі на могілкі, пачынаючы з 10 - 11 гадзін дня. Там чакалі, калі бацюшка пачытае службу па пакойных, затым на магілы або радам рассцілалі настольнік і елі, запрашаючы сваіх продкаў у госці. Перад гэтым на магіле качалі фарбаваныя яйкі, малюючы крыж. Гэтыя яйкі або аддавалі суседзям, або астаўлялі на магіле. Браць іх назад нельга, патрэбна заўсёды аддаць - дзецям або дарослым. У нашай мясцовасці і зараз дзеці ходзяць па могілках, ім даюць цукеркі, яйкі. Перад Радуніцай заўсёды прыбіраюць магілы, фарбуюць крыжы, а на Радуніцу прыносяць штучныя і жывыя кветкі, вянкі, вешаюць новыя ручнікі.

Наступным значным веснавым святам з'яўляецца **Юрый**, які адзначаецца **6 мая**. На Юр'я выганяюць скаціну на пашу, гэта даўняе земляробчае свята першага выгану кароў. У гэты дзень, каб быць здаровым, неабходна пахадзіць босаму па расе, або пакачацца па роснай траве. Як і ў іншых народных святах на Юр'я цесна пераплятаюцца язычніцкія і хрысціянскія вытокі. Пасля службы ў царкве разам з бацюшкам ішлі за сяло, асвячалі ваду, акраплялі жыта, а потым дома гэтай вадой акраплялі сваё жыта, гаспадарку.

Звычайна ў маі адзначалася Пераплаўная серада (чацвёртая серада пасля Паскі), пасля гэтага свята можна купацца да Іллі.

**22 мая** адзначаецца **Мікола Летні**. Лічылася, што да Міколы павінен выйсці колас. З гэтым святам звязвалі з'яўленне камароў і мошак: "Прыйдзе Мікола, высыпле мошак з прыпола". Трэба адзначыць, што сярод святых, якія адзначаюцца Хрысціянскай царквой Мікола Цудатворац вельмі шануецца. Замыкае вясновыя святы і пачынае летнія Тройца.

## Летнія святы

На заканчэнне мая – першую палову чэрвеня прыпадае цэлы цыкл свят і прысвяткаў, вядомых под агульнай назвай Тройца. Пачынаюцца летнія святы Тройцай – святам Святой Тройцы, якая адзначаецца на пяцідзесяты дзень пасля Паскі. Абрадавы комплекс траецкіх свят адзначаецца на працягу амаль двух тыдняў. Напярэдадні, у суботу, спраўляюць Траецкія (Духаўскія) дзяды, ў царкве адпраўлялі памінальную службу, а дома рыхтавалі посную вячэру “дзядам”. У суботу на вокны, сталы клалі “май” – галінкі аеру (касатаргі), любісціку мяты, іншай зелені, упрыгожвалі зелянінай хаты: абтыркваі іх галінкамі бярозы, ліпы, клёна – “ставілі май”. Пазней, на чацвёрты дзень Тройцы, у сераду засохлыя галінкі здымалі і клалі у пуню пад сена, каб не заводзіліся мышы, а таксама утырквалі пад страху хлява ад навальнічных

пажараў і буры. Некалькі галінак аеру, любісціку клалі ў сундук ад молі. У першы дзень Тройцы ў царкву ішлі з кветкамі, якія асвячаліся. Гэты букет засушваўся, затым у настоі гэтых кветак, аеру купалі дзяцей, заварвалі чай для хворых, мылі галаву. На трэці дзень звычайна асвячалася вада ў Варварынскай крыніцы. Пасля гэтага прысутныя набіралі сабе асвечанай вады, расцілалі настольнікі і святкавалі. Гэтай вадой лячыліся, пырскалі ў хаце, падвор'і.







Асвячэнне вады ў Варварынскай крыніцы на Тройцу

Да свята Тройцы імкнуліся закончыць праполку, бо тры дні нельга нічога рабіць, таксама да Тройцы нельга было загатаўляць бярозавыя венікі, на працягу траецкага тыдня забаранялася рабіць плот. Праз тыдзень пасля Тройцы пачынаўся Пятроўскі пост. У гэты час пачыналася касавіца. Пачатак гэтых работ адзначаўся так званымі “касавіцкімі” песнямі. Нажаль, іх запісаць ужо немагчыма. У святкаванні хрысціянскага свята Тройцы зноў цесна пераплятаюцца як рэлігійныя так і язычніцкія карані. Вытокам Тройцы з’яўляецца язычніцкае свята, у якім праглядаецца культ продкаў і раслінасці, якое было пазней прымеркавана царквой да Пяцідзесятніцы (50-ы дзень пасля Пасхі).Наступны тыдзень пасля Сёмухі называецца русальны (русальная нядзеля), але ў нашай мясцовасці гэта назва не сустракаецца. У нашай мясцовасці русалку на Тройцу не вадзілі.

Адным з значных язычніцкіх свят з’яўляецца Купала, якое адзначаецца з вечара 6 ліпеня і 7 ліпеня. Купалле – старажытнае абрадавае свята сонца і агню, урадлівасці і росквіту зямлі, прымяркоўвалася да летняга сонцастаяння. Хрысціянскай царквой у гэты дзень адзначаецца нараджэнне Іаана Хрысціцеля, але гэта свята называецца ў народзе Іван Купала. Напярэдадні гэтага свята, **6 ліпеня**, пасля чарады, **вадзілі русалку**. Выбіралі дзяўчыну, упрыгожвалі яе ўсю кветкамі, адзявалі вянок, вялі па вуліцы. Пры гэтым спявалі песні (дадатак 4).

Гаспадары выносілі і давалі цукеркі, каржы і іншае. Дзеці і моладзь адзяваліся ў цыган і з крапівай хадзілі па сялу, варажылі сустрэчным, за што атрымлівалі пачастунак, а калі не давалі, то таго джыгалі крапівай. Таксама вадзілі мядзведзя. Пасля русалку вялі ў жыта і качалі яе ў жыце. Затым ішлі у пэўнае месца, дзе хлопцы распальвалі касцёр, кідалі ў яго вянок, частаваліся, гулялі, скакалі цераз вогнішча, спявалі песні. Да гэтага часу захаваліся ўяўленні аб русалцы: зімой жыве яна на столі, а вясной, калі жыта ў колас ідзе, пасяляецца ў жыце, на Іллю пераходзіць жыць у сад, на яблыні, а пасля другой Прачыстай зноў жыве на столі.

На вароты, хворткі, хлявы увечары вешалі крапіву ад ведзьмы, каб яна не даіла карову, не зрабіла чаго дрэннага ў гаспадарцы. На Івана казалі: “На Івана ноч адарвана”





Ваджэнне русалкі, в. Маркавічы

**9 ліпеня** ў в. Глыбоцкае адзначаецца свята **абраза Ціхвінскай Божай Маці**. Некалькі год назад гэтая ікона абнавілася, з таго часу ў гэты дзень у царкву Раства Багародзіцы на службу прыязджаюць паломнікі, праводзіцца крэсны ход.

Наступнае ліпеньскае свята – **Пятро**. Канец "Пятроўкі" – Пятроўскага паста, які пачынаўся ад панядзелка пасля Траецкага тыдня, наступаў **12 ліпеня**. Хрысціянскае свята ў гонар апосталаў Святых Пятра і Паўла супадае са старадаўнім земляробчым святам, завяршэннем Купалля. Пятроўка – пара ўборкі траў, нарыхтоўкі сена. На працягу Пятроўкі жанчыны назапашвалі масла і тварог. Казалі: "Пятроўка – галадоўка", "Чакай Пятра, з'ясі масліца", "Прыдзе Пятро, сабярэ мошак ў вядро", таму што пасля гэтага свята станавілася менш мошак. На Пятра пастуху, калі выганялі карову, давалі сыр і масла. Пасля царквы, к абеду хадзілі ў госці, "куміліся", у апошнія дзесяцігоддзі "куміліся" толькі дзеці. Калі "куміліся" каля лесу, рэчкі, раскладвалі вогнішча, ля якога частаваліся блінцамі,
яечняй.

На другі дзень Пятра зажыналі жыта. Пелі жніўныя песні (дадатак 4). Зажынкі пачыналіся з таго, што жняя апраналася ў святочнае адзенне, брала серп і ішла на поле. Зажынаючы першую жменю жыта, прыгаворвала: "Памажы, Божа! Стань мой сноп на сто коп". Першае перавясло яна падпяразвала сабе на пояс, каб "у час жніва лёгка жалася, сярэдзіна не балела, ручанькі не млелі, ножанькі не дзервянелі". Заканчэнне жніва суправаджалася дажыначнымі абрадамі. Калі зжыналі жыта – апошнія некалькі каласоў звязвалі чырвонай лентай, прыгіналі да зямлі, рабілі "бараду". Пад каласы лажылі кавалак хлеба і солі з малітваю і паклонамі. Пасля гэтага жняя качалася па полі і казала: "Ніўка, ніўка, аддай маю сілку". Калі зжыналі жыта, з апошняга рабілі вянок, адзявалі на адну з дзяўчат. Апошні сноп неслі з песнямі да гаспадара, аддавалі яму сноп, яго ставілі на кут, а гаспадар "прастаўляўся", частаваў жней. Пасля Пятра да Макавея быў мясаед.

Першае жнівеньскае свята – **Ілля**, якое адзначаецца **2 жніўня**. Прарок Ілля Ўвабраў у сябе рысы язычніцкага бога Перуна, валадара граму і маланкі. Успрымаецца як канец лета. Казалі: "Прыдзе Ілля, надзелае гнілля". Да Іллі імкнуліся ўбраць цыбулю, пажаць жыта, нарыхтаваць сена. У гэты дзень катэгарычна забаранялася працаваць, лічылася, што разгневаны прарок можа спаліць у час навальніцы селішча, пабіць градам поле. Пасля Іллі забаранялася купацца.

**4 жніўня Марыя Магдаліна** – аброчны дзень у в. Гадзічава. У царкве асвячалася вада, пасля асвячаліся двары ў в. Гадзічава. Вечарам была "Свяча" – святкаванне ў адным з дамоў дня "Магдаліны". Затым ікону Марыі Магдаліны пераносілі ў іншую хату.

 

Свята Марыі Магдаліны ў в. Гадзічава

**9 жніўня** святкуецца **Панцеляймон, “Панціліман” (Вялікамучанік Панцеляймон)**. У в. Маркавічы гэта аброчны дзень. Жыхары даўно абракліся ў гэты дзень нічога не рабіць, маліцца святому Панцеляймону, каб ён іх аберагаў. Вечарам у адным з дамоў адбывалася свята “Свяча”. Збіраліся, потым правілі службу каля іконы Панцеляймона, затым вячэралі. Раней ікона передавалася к наступнаму гаспадару, у якога яна будзе цэлы год. У гэты дзень бацюшка асвячаў ваду і двары ў в. Маркавічы.

Наступны пост – Спасаўскі пачынаўся з **14 жніўня**, свята **Макавея – (7** мучанікаў Маккавеяў), **першы Спас** – свята маку і мёду, у царкве асвячалі мёд і мак, лекавыя травы. Маку надавалася значэнне ахоўнага сродку ад ведзьмакоў. Таму асвечаны мак захоўвалі як і свечаную ваду на працягу года

**19 жніўня** праваслаўнае свята называецца **другі Спас**, або яблычны Спас. У гэты дзень у царкве асвячалі яблыкі, якія забаранялася есці да Спаса, бо яны лічыліся грэшнымі пладамі. Жанчыны, у якіх памерла дзіця не елі яблыкі і пасля асвячэння на Спаса на працягу 40 дзён. За гэта на тым свеце іх дзеці атрымлівалі яблык ад Бога.

**26 жніўня** свята **Ціхана Задонскага**. У гэты дзень у 1941годзе жыхары в. Гадзічава і Маркавічы абракліся святкаваць гэты дзень, каб Святы Ціхан абараніў іх у час вайны ад ворагаў.

Перад наступным святам Прачыстай у пятніцу-суботу адзначаліся Спасаўскія дзяды. **28 жніўня** адзначалася **Першая Прачыстая** (Успенне Прэсвятой Багародзіцы). У царкве асвячалася жыта, зерне, хлеб. З гэтага дня можна было сеяць азімае жыта. Гэта свята ўраджаю і падрыхтоўкі да сяўбы. З Прачыстай заканчваўся Спасаўскі пост. **29 жніўня** адзначаецца **трэці Хлебны Спас**. Да трэцяга Спаса ў асноўным заканчваліся асноўныя ўборачныя работы. Асвячалі семянное зерне для пасеву азімых культур. Пасля Першай Прачыстай рассцілалі на лугах і паплавах лён, сушылі і абмалочвалі збожжавыя.

## Асеннія святы

Сярод асенніх свят найбольш вылучаецца **Другая Прачыстая** (Нараджэнне Багародзіцы), якая адзначаецца **21 верасня**. Да яе адзначаецца **11 верасня Іван Галавасек** (Усячэнне галавы Прарока Прадцечы Хрысціцеля Гасподня Іаана). У гэты дзень елі поснае, не рэзалі, не секлі, асабліва гэта дачынялася круглых прадметаў. **19 верасня “Чуды” (Міхайла)**. У гэты дзень нічога не рабілася, бо лічылася, што ў гэтае свята, штоб ні зрабіў, будзе хужэй. Чуды – гэта прысвятак свята Прачыстай. Да Прачыстай заканчваліся асноўныя работы ў полі. Казалі: “Прышла Прачыста – у полі чыста”. Свята Прачыстай – гэта старажытнае свята заканчэння ўборкі зерневых, водгук язычніцкага свята земляробчага культу бога сонца, бога дастатку, і багацця. У нашай мясцовасці своеасаблівых абрадаў гэта свята не захавалася. У в. Глыбоцкае гэта прастольнае свята.








Ярмарка ў в. Маркавічы на Здвіжанне

Двайным святам для жыхароў в. Маркавічы з’яўляецца **Уздвіжанне (Здвіжанне)**, бо акрамя таго, што гэта праваслаўнае свята Уздвіжанне Чэснага і

Жыватворнага Крыжа Господня, гэта дзень вызвалення вёскі ад фашысцкіх захопнікаў. У 1943 годзе раніцай **27 верасня** савецкія войскі вызвалілі вёску.

Гэта свята таксама мае язычніцкую аснову – гэта свята "закрывання" зямлі на зіму, якое звязана з вужамі. У гэты дзень не хадзілі ў лес, бо там нібы вужы і гадзюкі збіраліся ў клубкі, каб схавацца на зіму. Расказваюць, што адзін мужык не паслухаў і пайшоў у лес, набраў поўны кораб грыбоў і пахваляўся, што гэта ўсё не праўда. А калі паглядзеў у яго, там адны вужы.

Самым значным святам у кастрычніку з'яўляецца **Пакрова (Трэцяя Прачыстая)**, якая адзначаецца **14 кастрычніка**. У хрысціянстве гэта свята звязана з Пакрывалам Маці Божай, у народным календары з пакровам зямлі. Якая павінна адпачыць да наступнага года. На Пакрову заканчваўся выпас жывёлы, у гэты дзень разлічваліся з пастухамі.

Пасля службы ў царкве ехалі ў Гарнастаеўку (вёска ў Рэпскінскім раёне Чарнігаўскай вобласці) на ярмарку, дзе куплялі пёрсцёнкі, завушніцыі, маністы з іконамі, крэшчыкамі, дзецям пернікі. Да Пакроваў сваталі дзяўчат, а пасля Пакровы наступала пара асенніх вяселляў. Казалі: "На Пакрова дзеўка гатова, а прайшла Пакрова, раве, як карова".

Восенню, **2 лістапада**, адзначаецца адно са значных памінальных свят – **Дзмітраўскія Дзяды**. Гэта свята не менш важнае, як і Радуніца. Рыхтавалі посную вячэру. У пятніцу вечарам уся сям'я збіралася за сталом. Бацька падымаўся, хрысціўся, за ім таксама хрысцяцца і ён кажа: "Усе дзяды, чужыя і нашыя хадзіце, да нас вячэраць ". Потым ужо ядзяць. На стол ложацца лішнія лыжкі для дзядоў. Калі ядзяць, успамінаюць пра памерлых родзічаў. Заканчваюць есці кашай, ежу астаўляюць на стале да рання. Раніцай прыбіраюць ідуць царкву, туды адносяць цукар, хлеб, цукеркі, яйкі. У царкве і, калі ідуць назад, раздаюць цукеркі усім, каго сустрэнуць. Восеньскіх дзядоў трое: першыя – Дмітраўскія, другія – Кузьма-Дзям'янаўскія (перад мучанікам Кузьмой і Дзям'янам), трэція – Міхайлаўскія, перад архістратыгам Міхаілам.

**26 лістапада,** на **Іаана Златавуста** ў в. Паддабранка прастольнае свята, праводзіцца "Свяча".

21 лістапада – апошняе асенняе свята Міхайла (Архістратыга Міхаіла). Гэта свята жыхароў в. Маркавічы: у в. да 30-ых гадоў была царква Архістратыга Міхаіла, таму гэта свята з'яўляецца прастольным. Заўсёды у гэты дзень прыязджалі госці з суседніх вёсак. У гэты дзень была «Свяча» Міхайле.

27 лістапада адзначаецца дзень Вялікага праведніка апостала Піліпа. Пасля гэтага, з 28 лістапада пачынаўся самы суровы Піліпаўскі пост, які працягваецца да Ражаства.



“Свяча” ў в. Паддабранка

# Сучаснае бытаванне каляндарных свят і абрадаў.

Для сучаснага бытавання каляндарных свят і абрадаў характэрна амаль поўнае знікненне старажытных славянскіх свят (акрамя Шчодрыкаў) і перавага свят хрысціянскага календара. Адгалоскі язычніцкіх свят можна прасачыць толькі ў некаторых абрадах: упрыгожванне дамоў зелянінай на Тройцу, вывешванне крапівы на гаспадарчыя пабудовы напярэдадні Івана Купалы, застолле на могілках на Радуніцу, кумленне на Пятра. Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў назад у нашых вёсках праводзіўся абрад “Сула”, але тагачасныя ўлады забаранілі яго праводзіць. Але ў апошнія гады, дзякуючы ініцыятыве раённага аддзела адукацыі, райвыканкама гэты ўнікальны абрад адраджаецца. Ёсць магчымасць адрадзіць і такі абрад, як “Ваджэнне русалкі”.

Да гэтага часу ў нашай мясцовасці захаваўся абрад насіць “Звязду” на другі дзень Ражаства.

Значную роля па адраджэнні і захаванні народных свят рэгіёна належыць клубу “Спадчына” пры ДУА “Маркавіцкі дзіцячы сад-сярэдняя школа”. Члены клуба разам з вучнямі і настаўнікамі школы прымаюць актыўны ўдзел у адраджэнні свята “Сула”, якое ўжо шэсць год праводзіцца на базе школы.





Свята “Сула”, 2010 г.

У школе сабрана багатая калекцыя народнага касцюма, а таксама зроблены аўтэнтычныя касцюмы для членаў клуба “Спадчына” і фальклорнага калектыву “Чарнабрыўцы”. Акрамя “Сулы” вучнямі адроджаны святы “Ваджэнне русалкі”, “Гуканне вясны”, “Дзяды”, кожны год на базе школы праводзіцца рэгіянальнае свята “Святое Ражаство людзям радасць прынясло”.

Вучні прымаюць актыўны ўдзел у вывучэнні фальклорнай спадчыны сваёй малой радзімы, займаюцца даследчай работай у гэтым напрамку. Члены фальклорнага калектыву “Чарнабрыўцы” з’яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі абласных фальклорных свят “Шануйце спадчыну сваю”, імкнуцца не толькі захоўваць культуру сваёй мясцовасці, але і прапагандаваць яе.





“Святое Ражаство людзям радасць прынясло”



“Ваджэнне русалкі”



Фальклорны калектыў “Чарнабрыўцы”

Акрамя галоўных праваслаўных свят для нашых вёсак характэрны прастольныя (храмок) і аброчныя, на якія адзначаецца свята “Свяча” (дадатак 5). Прастольныя святы адзначаюцца звычайна ў дзень ушанавання святога, ў гонар якога названа царква ў вёсцы, напрыклад, у в. Маркавічы – Міхайла, у в. Гадзічава – Кацярына. Аброчныя звязаны з нейкай падзеяй, калі жыхары абракліся нічога не рабіць, маліцца святому, каб ён іх аберагаў.

Традыцыйным стала правядзенне ярмарак у в. Маркавічы на Здвіжанне і ў канцы Масленага тыдня ў Прошчаную нядзелю.

Такім чынам, унікальнасць і багацце фальклорнай спадчыны в. Маркавічы і наваколля дазваляе выкарыстоўваць яе для развіцця этнатурызму. Для гэтага неабходна захаваць існуючыя святы, адрадзіць, акрамя сулы яшчэ рад іншых каляндарных свят і абрадаў мясцовасці.

# Заключэнне

Вывучэнне фальклорнай спадчыны в. Маркавічы і наваколля дае магчымасць зрабіць наступныя вывады:

Каляндарна-абрадавы цыкл народных свят у асноўным адпавядае бытаванню яго на тэрыторыі Беларусі. Па значнасці вылучаюцца ў зімовым цыкле Ражаство, Шчодрыкі і Крашчэнне, вясновым - Благавешчанне і Паска, летнім - Тройца і Спас, восеньскім - Прачыстая.

У нашай мясцовасці існуюць пэўныя лакальныя адрозненні ад іншых рэгіёнаў Гомельшчыны ў каляндарнай абраднасці народных свят. Гэта абрад “Сула" на другі дзень Паскі, "Нараджэнне калодкі" ў масляны тыдзень; “Ваджэнне русалкі” ў нашых вёсках адбывалася не ў Троіцкі тыдзень, а напярэдадні Івана Купалы. Да гэтага часу захаваўся такі абрад святкавання Ражаства, як "Звязда".

Народныя святы і абрады ўяўляюць сабой цеснае перапляценне язычніцкіх каляндарна-земляробчых і хрысціянскіх свят. Гэта асабліва праяўляецца ў зімовым (Ражаство - Шчодрыкі (Васіль) - Крашчэнне) і веснавым (Благавешчанне - Гуканне вясны, Паска - Сула) цыклах каляндарных свят і абрадаў. У апошні час назіраецца перавага праваслаўных традыцый перад язычніцкай абраднасцю. Гэта больш праяўляецца ў час адзначэння такіх летніх свят, як Спас, Ілля, асенніх - Прачыстая, Іван Галавасек і інш. Адгалоскі язычніцкіх свят можна прасачыць у некаторых абрадах: упрыгожванне дамоў зелянінай на Тройцу, вывешванне крапівы на гаспадарчыя пабудовы напярэдадні Івана Купалы, застолле на могілках на Радуніцу, кумленне на Пятра.

Для сучаснага бытавання каляндарных свят і абрадаў характэрна амаль поўнае знікненне старажытных славянскіх свят (акрамя Шчодрыкаў) і перавага свят хрысціянскага календара. Акрамя галоўных праваслаўных свят для нашых вёсак характэрны прастольныя і аброчныя, на якія адзначаецца свята “Свяча”. Прастольныя святы (храмок) адзначаюцца звычайна ў дзень ушанавання святога, ў гонар якога названа царква ў вёсцы, напрыклад, у в. Маркавічы - Міхайла, у в. Гадзічава - Кацярына, в. Глыбоцкае - Прачыстая. Аброчныя звязаны з нейкай падзеяй, калі жыхары абракліся нічога не рабіць, маліцца святому, каб ён іх аберагаў. Аброчным святам у в. Маркавічы з’яўляецца Панцеляймон, в. Гадзічава – Марыя Магдаліна.

Унікальнасць і багацце фальклорнай спадчыны в. Маркавічы і наваколля дазваляе выкарыстоўваць яе для развіцця этнатурызму. Для гэтага неабходна захаваць існуючыя святы, адрадзіць, акрамя “Сулы” яшчэ рад іншых каляндарных свят і абрадаў мясцовасці.

# Літаратура


1. Живописная Россия. Рэпрынтнае выданне 1882 г., том 3. Мн.: “Беларуская энцыклапедыя”,1994.
2. Загорульский Э. М. Историческое краеведение Белорусии Мн. : издательство БГУ имени Ленина, 1980.
3. Кавалёва Р. М. Умовы фарміравання і прынцыпы вывучэння лакальных фальклорна-этнаграфічных зон. Палявая фалькларыстыка і этнаграфія. Мн., 2008.
4. Катовіч А., Крук Я. Зімовыя святы. Беларускі народны каляндар. Мн.: “Мастацкая літаратура”, 2004.
5. Катовіч А., Крук Я. Веснавыя святы. Кніга 1. Беларускі народны каляндар. Мн. “Мастацкая літаратура”, 2004.
6. Катовіч А., Крук Я. Веснавыя святы. Кніга 2. Беларускі народны каляндар. Мн. “Мастацкая літаратура”, 2005.
7. Катовіч А., Крук Я. Летнія святы. Беларускі народны каляндар. Мн. “Мастацкая літаратура”,2010.
8. Коваль У. І., Новак В. С. Беларускія народныя святы і звычаі. Гомель, 1993.
9. Лабачэўская В. А. Актуальныя праблемы даследаванняў традыцыйнай культуры Беларусі. Палявая фалькларыстыка і этнаграфія. Мн., 2008.
10. Ліцвінка В. Святы і абрады беларусаў. Мн.: “Беларусь”, 1997.
11. Лозка А. Беларускі народны каляндар. Мн.: “Полымя”, 2008.
12. Народная культура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мн.: БелЭ, 2002.
13. Новак В. “На гранай нядзелі русалкі сядзелі”. Гомель, 2005.
14. Новак В. Народная духоўная спадчына Гомельскага раёна. Гомель: “Палесдрук”, 2007.
15. Памяць. Гомельскі раён. Кніга 2. Мн.: Белта, 1998.
16. Пилипенко М. Ф. Этнография Белоруссии. Мн.: «Высшая школа», 1981.
17. Хвір Н. Д. Нематэрыяльная спадчына Беларусі. Палявая фалькларыстыка і этнаграфія. Мн., 2008.
18. Штэйнер І. Ф., Новак В. С. Роднае. Фальклорна-этнаграфічная спадчына Гомельскага раёна. Мазыр: Белы вецер, 2000.

## Дадатак 1. Спіс інфарматараў.

Вёска Маркавічы

1. Сіманчук Алена Пятроўна, 1926 г. н.
2. Пытлева Алена Фёдараўна, 1938 г. н.
3. Бобашава Ніна Паўлаўна, 1940 г. н.
4. Рабцава Соф’я Фядосаўна, 1929 г. н.
5. Мацукова Лідзія Васільеўна, 1927 г. н.
6. Гарбочова Паліна Фёдараўна, 1933 г. н.
7. Сяргеенка Лідзія Іванаўна, 1929 г. н.
8. Белкіна Еўдакія Міхайлаўна, 1937 г.н.

Вёска Гадзічава

1. Басава Таццяна Сяргееўна, 1934 г. н.
2. Зайцава Анастасія Нікіфараўна, 1926 г. н.
3. Жытнікава Любоў Пятроўна, 1922 г. н.

Вёска Глыбоцкае

1. Сіманенка Ганна Аляксандраўна, 1938 г. н.

Вёска Рагі-Ілецкі

1. Сарокіна Анастасія Фядосаўна, 1923 г. н.

**Дадатак 2. Зімовыя абрады. “Звязда”. Шчадроўныя песні**

# " ЗВЯЗДА "



Падыходзяць са “Звяздой” да хаты і пытаюцца: “Ці пусціце “Звязду” ? Калі пускаюць, то заходзяць у хату. Станавяцца у кут тварам да ікон і спяваюць кандак:



Рождество твое, Христе Боже наш,
Воссия мирови свет разума,
В нём бо звездой служащия
Звездою учахуся
Тебе кланятися Солнцу правды
И тебе с высоты востока,
Господи, Слава Тебе.
Слава Отцу и Сыну и Святому Духу
И ныне и прысно и вовеки веков. Аминь.
Дева днесь пресущественного рождает,
И земля вертеп неприступному приносит
Ангели с пастырьми славословят,
Волхви же со звездою путешествуют,
Нас бо ради родися отроча младо Превечный Бог.

Тады хто-небудзь адзін гаворыць:
“В небі звязда свяціла,
Як маці Ісуса радзіла,
Ў яслі палажыла,
Сенам прытрусіла,
Прыхадзілі тры князя,
Прынасілі тры дара.
А мы тыя дары прынімаем,
Да вас із Святым Ражаством паздраўляем!”
Пасля гэтага пяюць сальму:

В Раждзество Хрыстова Ангел прыляцеў,
Ён лецеў па небу і ўсім песню пеў:
"Все людзі лікуйце, в сей дзень таржэствуйце,
Днесь Хрыстова Раждзества.

Я лечу па небу і вам весць прынёс,
Што ў верцепі беднам радзіўся Хрыстос.
Скарэй паспяшайця, дзіцятка навешчайця
Наварождзенага."

Пастушкі ў пешчеру раньше всіх прыйшлі,
В яслях на саломке Госпада найшлі.
Стаялі, рыдалі, Хрыста праслаўлялі
І Марыю, маць яго.

А валхвы, увідзеў ясную звезду
Прышлі пакланіцца Госпаду Тварцу.
Бога праслаўлялі, Хрысту дары далі:
Злата, смірну і ліван.

А Ірад всезлобный а Хрысце узнаў,
Убіці младзенца воінаў паслаў.
Всіх дзіцей убілі, мечы прытупілі,
А Хрыстос в Егіпці быў.

Многа мы грэшылі, Спасе пред табой.
Все мы людзі грэшныя, Ты адзін Святой.
Прасці прегрэшэнье. Даждзь нам ісцэленье
В дзень Святаго Раждзества.

Могуць сказаць яшчэ: "Прапелі адну, разрэшыце другую, ваш дом звеселіці, вясёлымі быці!" і спяваюць яшчэ адну сальму:

В Віфліемі Іудзейскам
Там была ставенька,
Там Ісусе нарадзіўся,
Дзіціна маленька.

А ў той час пастушкі
Сцераглі авечак,
Як пачулі пра Ісуса,
Прыбеглі скарэнька.

Прыбеглі, прыбеглі
Дай сталі пытаці,
Ці дазволіць Божа Маці
Ісуса благаслаўляці

Ісусе, Ісусе,
Мы цябе благаем,
Зміласердуйся над намі
І над нашым краем.

А ў канцы кажуць: "Дай Бог вам здароўя, шчасця, благапалучча на многія лета!" і спяваюць:

Многая лета, як бы нам да лета,

Да пойдзем у поле, да пажнём мы жыта,
Да паставім копы, да скокнем у гопы,
Гоп-гоп-гоп-гоп-гоп, а чарачка хлоп!
Многая лета, многая лета, многая лета,
Многая лета, многая, многая лета!”

За гэта іх дзякавалі, давалі грошы або што з ежы, цалавалі іконку ў “Звяздзе”. Затым “Звязду” неслі ў другую хату.



# Шчадроўныя песні



Гурт дзяўчат падыходзіў да хаты і хто-небудзь пытаў: "Спець песню?" - "Спейце". Пасля гэтага выконваліся шчадроўныя песні.

А ў лузе красна каліна,
Сяты вечар!
Крашай за таго Надзечка ў таткі,
Святы вечар!
Па двару хадзіла, увесь двор скрасіла,
Святы вечар!
У сені выйшла, сені заззялі,
Святы вечар!
У хату ўвайшла, паны стаялі,
Святы вечар!
Паны стаялі, яе ўвідалі,
Святы вечар!
Ці ты паноўна, ці каралеўна,
Святы вечар!
Я не паноўна, не каралеўна,
Святы вечар!
Я ў таткі дачка, як ягадка.
Святы вечар!

У садзе гулялі Ян і Ганначка,
Святы вечар!
"Слухай, Ганначка," – кажа Яначка -
Святы вечар!
" Раскажу табе дзіва-дзіўнае,
Святы вечар!
Што ў нас на Пятра Дунай замярзаў,
Святы вечар!
Дунай замярзаў, а я прасякаў,
Святы вечар!
А я прасякаў, каня напаваў",
Святы вечар!
"Слухай, Яначка," – кажа Ганначка,-
Святы вечар!
" У нас на Ражаство ружа расцвіла,
Святы вечар!
Ружа зацвіла, я вянок звіла,
Святы вечар!
Я вянок звіла, у танок пайшла,
Святы вечар!
У танок пайшла, сабе трох знайшла,
Святы вечар!

З-пад варот - варот рэчачка бяжыць,
Святы вечар!
На той рэчачцы кладачка ляжыць,
Святы вечар!
На той кладачцы конічак стаіць,
Святы вечар!
На тым конічку Ванечка сядзіць,
Святы вечар!
Ванечка сядзіць, стрэлачку дзяржыць,
Святы вечар!
Хваліцца канём перад каралём:,
Святы вечар!
Няма ў караля такога каня,
Святы вечар!
Хваліцца стрэлкамі перад дзеўкамі,
Святы вечар!
Няма ў дзевачак такіх стрэлачак,
Святы вечар!
А ў мяне маладога ўсяго многа,
Святы вечар!

Або:

А ў лузі цячэ рэчанька,
Святы вечар!
На той рэчаньцы кладачка ляжыць,
Святы вечар!
На той кладачцы конічак стаіць,
Святы вечар!
На тым конічку Васечка сядзіць,
Святы вечар!
Хваліцца канём перад каралем,
Святы вечар!
Хваліцца стрэлкамі перад дзеўкамі,
Святы вечар!
Хваліцца шапкаю перад мамкаю,
Святы вечар!

Стаяў явар тонкі, высокі,
Шчодры вечар добрым людзям!
Тонкі, высокі на лісцях шырокі,
Шчодры вечар добрым людзям!
А пад яварам дый услончычак,
Шчодры вечар добрым людзям!
А на ўслончычку малады Мішанька,
Шчодры вечар добрым людзям!

Малады Мішанька лук напінае,
Шчодры вечар добрым людзям!
Лук напінае, у арла страляе,
Шчодры вечар добрым людзям!
Не страляй у мяне, малады малодчык,
Шчодры вечар добрым людзям!
Я буду табе ў добрай прыгодзе,
Шчодры вечар добрым людзям!
Як будзеш ты да жоначку весці,
Шчодры вечар добрым людзям!
Пастаўлю я стаўбы залатыя,
Шчодры вечар добрым людзям!
Паўю шнуры шаўковыя,
Шчодры вечар добрым людзям!
А як наступіць туча-хмара,
Шчодры вечар добрым людзям!
Спушчу крыло – сіза пяро,
Шчодры вечар добрым людзям!
Дай накрыю цябе маладага,
Шчодры вечар добрым людзям!
Цябе маладога дай з дружынаю,
Шчодры вечар добрым людзям!
З дружынаю, з дзеўчынаю,
Шчодры вечар добрым людзям!

Як на моры дай на сіненькам,
Шчодры вечар добрым людзям!
Маці Божая рызы паласкала,
Шчодры вечар добрым людзям!
Рызы паласкала, на прастоле клала,
Шчодры вечар добрым людзям!
Адкуль узяліся дай тры ангелы
Шчодры вечар добрым людзям!
Узялі рызачкі дай пад крылачкі,
Шчодры вечар добрым людзям!
Паняслі рызы дый да цэрквачкі,
Шчодры вечар добрым людзям!
Сама цэркаўка адчынілася,
Шчодры вечар добрым людзям!
Самі свечачкі загарэліся,
Шчодры вечар добрым людзям!
Самі кніжачкі зачыталіся,
Шчодры вечар добрым людзям!
Самі званы зазваніліся,
Шчодры вечар добрым людзям!

Сама службачка заслужылася,
Шчодры вечар добрым людзям!
За каго, за каго цэрква служыцца?
Шчодры вечар добрым людзям!
За Івана - пана, за жэну яго,
Шчодры вечар добрым людзям!
А за жоначку – сараковачку,
Шчодры вечар добрым людзям!
За жэну яго і за дзетачак,
Шчодры вечар добрым людзям!
Шэй за дзетачак, сем капеечак,
Шчодры вечар добрым людзям!
А за Івана - пана і цаны няма,
Шчодры вечар добрым людзям!

А ў Івана пана умная жана,
Бог яму даў,
Не завідуйце панавы брацця,
Дасць Бог і вам!
Ой, закупілі тры гарадочкі,
Бог яму даў,
Не завідуйце панавы брацця,
Дасць Бог і вам!
А первы горад – усё з панамі,
Не завідуйце панавы брацця,
Дасць Бог і вам!
А другі горад – усё з казакамі,
Не завідуйце панавы брацця,
Дасць Бог і вам!
А трэці горад – усё з мужыкамі,
Не завідуйце панавы брацця,
Дасць Бог і вам!
А не з панамі, суд іх судзіці,
Не завідуйце панавы брацця,
Дасць Бог і вам!
…
У заключэнне спявалі:
Шчадруй, бадруй, вынось грошы,
Бо ў нас кароткія світкі,
Дык памерзлі лыткі!

**Дадатак 3. Вясеннія абрады “Гуканне вясны”, “Сула”, валачобныя песні**

# ГУКАННЕ ВЯСНЫ



На Благавешчанне заводзілі танок. Для гэтага расстаўлялі пэўным чынам дзяцей і між імі вялі танок. Пачыналі пець "вяснянкі", гукаць вясну. Кожны радок песні закончваўся выклікам: "Гу-у-у!". Сабіраліся жанчыны, дзяўчаты, заводзілі танок і спявалі:

\- Зімавалі, не спявалі, вясну ждалі.
Вясна, весна мая весна,
А што ж ты нам дый прынесла?
Старым бабам па кіёчку,
А дзевачкам па вяночку.
Звіла я вяночык ўчора
І з вячора, і з вячора
З зялёнага барвіночка
Дай павесіла на калочку.

Выходзьце, вяснянкі, / 2 разы
Спяваці пяснянкі.
Цёмная зялёная дуброва: гу-у-у.
Выходзьце стаўкамі, / 2 разы
Ды спявайце з намі.
Цёмная зялёная дуброва.
Зімавалі, не спявалі, вясну ждалі.
Цёмная зялёная дуброва: гу-у-у.

Дзеці гулялі ў “Падаляначку” і “Чыжыка”:

\- Дзе ж тут была падаляначка,
Дзе ж ты была маладзесенька?
Тут яна ўпала, да зямлі прыпала.
Устань, устань, падаляначка,
Прамый вочкі, як шкляначка,
Прычашы галоўка, да вазьміся ў бокі,
Да пайдзі у скокі, бяжы да Дунаю,
Бяры каголь с краю.

(Гульня “Чыжык”)

\- Чыжыку, чыжыку, пташка маленька,
Скажы нам, скажы нам, як сеюць мак?
Вось так- так, вось так- так, так сеюць мак.
(расце, цвіце)

(Спяваюць вяснянку)

Ой топ тапанец,
Пайшла дзеўка ў танец,
А за ёю гарабец.

Ой, топ тапанец,
Пайшла дзеўка ў танец,
А за ёю маладою
Усе птушкі чарадою.
Ой, топ тапанец,
Пайшла дзеўка ў танец,
А за ёю гарабец.
А ў верабейка шапка маленька./ 2 разы
Сядзіць на калочку, прадзе на сарочку,
А выпрадзе нітку, то пашые світку.
Ой, топ тапанец,
Пайшла дзеўка ў танец,
А за ёю гарабец.
Ой, топ тапанец,
Пайшла дзеўка ў танец,
А за ёю маладою
Усе птушкі чарадою.
Ой, топ тапанец,
Пайшла дзеўка ў танец,
А за ёю маладою.
Усе птушкі чарадою.
Ой, топ тапанец,
Залаты вам вянец!

# СУЛА



На другі дзень Паскі ў нашай мясцовасці (в. Глыбоцкае, Краўцоўка, Маркавічы, Гадзічава) вадзілі "Сулу". Назва, магчыма ад слова "сула" – вяртлявы, рухомы, непаседа. Напэўна, таму і некалькі рэк маюць такую назву – Сула, Сулак. Гэта свята аб'ядноўвае і язычніцкі абрад і найвялікшае свята хрысціян – Уваскрашэнне Хрыста (Паску).

Пачыналася "Сула" за в. Гадзічава. Збіралася многа людзей, ішлі з песнямі праз усю вёску, з кожнага дома выходзілі і далучаліся да людскога патоку. Потым ішлі да в. Маркавічы, а затым за вёскай гулялі, танцавалі, пелі.



"Сула" ў в. Глыбоцкае, пачатак 60-х гадоў

Пачыналася Сула так: ідуць жанчыны узяўшыся пад рукі і спяваюць.



"Сула" ў в. Маркавічы, 2010 г.

Як ішла сула, дай уздоўж сяла
І ўстрэла яна добра моладца,
Забрала сула добра моладца.
Па том моладцу некаму плакаці:
Мамка старая, сястра малая,
А жана млада да як ягада.
Дзе мамка плача, там рэчка цячэ,
Дзе сястрычанька, там крынічанька,
Дзе жана плача, там расы няма.
Мамка плача век да до веку,
А сястра плача год да году,
А жана плача да абедзейка,
Па абедаўшы ў зялён сад пайшла,
Ў зялён сад пайшла дай траіх знайшла.
Адна з жанчын кажа:
“Дзеўкі да жанчыны,
Бабы да маладзіцы,
Давайце завядом танка,
Штоб у нас усё радзіла,
І маланка нас не біла”.



Завод танка, в. Маркавічы, 2011 г.



Ставяць трох малых дзяўчынак, і кругом іх заводзяць танок:
А ў крывога танка, да не выведу канца.
Нада яго да выводзіці, канца ладу ізнаходзіці,
Нада яго весці, шоб вяночык плесці.
Вяду, вяду, да не выведу, пляту, пляту, да не выпляту.
Ой, вянку ж мой, вянку, кучаравый барвінку,
А я ж цябе пляла, шэй учора із вячора
Павесіла цябе на роўным калочку, на роўным калочку,
На шаўковым шнурочку.
А ў крывога танка, да выведу канца.



Яшчэ спяваюць:
Як на нашай вуліцы, шырокае возера.
Ой люлі, ой люлі, шырокае возера.
Як на тым на возеры, шэры гусі плавалі.
Ой люлі, ой люлі, шэры гусі плавалі.
Як наляцеў сіз арол, да на сваіх крылышках.
Ой люлі, ой люлі да на сваіх крылышках.
Да на сваіх крылышках, да ў залатых пёрышках.
Ой люлі, ой люлі, да ў залатых пёрышках
Дай ухваціў гусачку, за залаты пёрышкі.
Ой люлі, ой люлі, за залаты пёрышкі.
Як на нашай вуліцы, дзеўкі танка вадзілі.
Ой люлі, ой люлі, дзеўкі танка вадзілі.
Прыскакаў хлапец на коніку, дай ухваціў дзеўчыну.
Ой люлі, ой люлі, дай ухваціў дзеўчыну.
Дай ухваціў дзеўчыну, да за русу косаньку.
Ой люлі, ой люлі, да за русу косаньку.
Да за русу косаньку, да за белу ручаньку.
Ой люлі, ой люлі, да за белу ручаньку.
Як на нашай вуліцы, шырокая возера.
Ой люлі, ой люлі, шырокая возера.



Падшыбуюць дзяцей і спяваюць:
Падшыбну кабыліцу, высоку нарыліцу.
Стой кабыліца прама, нашае віны няма,
Нашага віна не п’юць, нашых дзевак не бяруць.

Тыя жанчыны якія падшыбуюць дзяцей кажуць:
“Вялікае расці”.
Затым спяваюць:
Чарнабрывы каралёк край гарода ходзіць\ 2 разы.
Чарнабрывы каралёк пажалуйця ў гарадок\ 2 разы.
Чарнабрывы каралёк у бокі вазьміся\ 2 разы.
Чарнабрывы каралёк нізенька ўкланіся\ 2 разы.
Чарнабрывы каралёк устань прымудрыся\ 2 разы.
Чарнабрывы каралёк красітва ўбярыся\ 2 разы.
Чарнабрывы каралёк у бокі вазьміся\ 2 разы.
Чарнабрывы каралёк нізенька ўкланіся\ 2 разы.
Хто небудзь крыкне: “У гарэпню!”

Увесь танок гульнёй “Гарэпня” ідзе да вулічнай дарогі, дзе выстраіваецца на ўсю вуліцу узяўшыся пад рукі, за імі таксама выстраіваюцца ўсе прысутныя. Усе ідуць па вуліцы спяваюць частушкі, песні.





Калі падышлі да стараны, якая прымае “Сулу”, адна з сулы падыходзіць да страчаемай, і тая, што стракае з паскай кажа:

Калі прымаў Ісус мукі, узялі яго пад рукі
Яго маці стаяла такі слава прамаўляла:
“Сыня мой, як будзеш ты васкрасаці,
Будуць цябе ангелы устрачаці,

З святым Васкрасенням паздраўляці Хрыстос Васкрэс!” Тая ёй адказвае: “Ваісціну Васкрэс!” (яны цалуюцца) далей яна кажа: “Дай Бог і на той год даждаць светлага Хрыстова Васкрасення у шчасці і здароўі Хрыстос Васкрэс!” Тая, што з паскай адказвае “Ваісціну Васкрэс !” ( яны цалуюцца), тады першая аддае ёй паску і кажа: “Хрыстос Васкрэс”, другая забірае паску, адказвае “Ваісціну Васкрэс” (яны цалуюцца) і тая, што стракала “Сулу”, запрашае за абрадавы стол.



Затым прысутныя ідуць за абрадавы стол, народнае гулянне працягваецца.



# Валачобныя песні



У першы дзень Паскі дзеці хадзілі па хросных, а тыя давалі яйкі, пірагі. Магчыма, гэта адгалоскі валачобнага абраду. Дзеці з валачобнымі песнямі хадзілі па дварах, што сведчыць аб існаванні валачобнага абраду ў нашай мясцовасці.

Прыйшлі к бабцы валачобнічкі,
Дала бабка па яечачку,
Сірата не бярэ і з двара не ідзе.
Дала бабка па яблачку,
Сірата не бярэ і з двара не ідзе.
Дала бабка па канфетачцы,
Сірата не бярэ і з двара не ідзе.
Дала бабка красную пані,
Сірата ўзяла і з двара пашла.

Вялік святы нам дзень настаў,
Са славай з гроба вассіяў
Хрыстос Гасподзь наш вечны свет,
Хрыстос васкрэс!
Суботня поўнач к нам прышла,
Зара ў нядзелю чуць узышла,
Нам ангел двер ва гроб атверз,
Хрыстос васкрэс!
В ту ноч ка гробу жоны шлі
І міротчэнае неслі,
Но там был ужас, гроб атвергт,
Хрыстос васкрэс!
І жоны плакаць ліш пашлі,
Што цела ў гробе не найшлі,
Но не смотрелі ў гроб –
Там хто-та есць,
Хрыстос васкрэс!
І ангел ім в ту ноч сказал:
"Хрыстос Гасподзь із гроба ўстаў,
Што ішчыце, его здзесь нет"
Хрыстос васкрэс!
То был блесцяшчы рызак лік,
Пасланный богам там для іх,
То светлый ангел был с небес,
Хрыстос васкрэс!
Ідзіце, дайце знаць а том
Его ўсім учэніком,
Прамолвіл ангел эту весць,
Хрыстос васкрэс!
В цэрквях лікуйце і ў дамах,
Всем жызнь адкрыта ў небесах,
Все людзі веселіцесь днесь, Хрыстос васкрэс!

Дадатак 4. Летнія абрады. “Ваджэнне русалкі”. Жніўныя песні.

# " Ваджэнне русалкі "



Напярэдадні свята Івана Купалы, 6 ліпеня, пасля чарады, вадзілі русалку. Выбіралі дзяўчыну, упрыгожвалі яе ўсю кветкамі, адзявалі вянок, вялі па вуліцы.
Пры гэтым спявалі:

Правяду русалку ў жыта,
А сама вярнуся да двара
Правяду русалку ў капусту,
А сама вярнуся ў хату.
Правяду русалку з лесу,
Рана, рана з лесу.
З лесу да ў ядранае жыта,
Вот там ёй і жыці.
Ой, правяду я русалку да броду,
А сама вярнуся дадому.
Ідзі, русалка, ідзі,
Ды нашага жыта не ламі.
Бо ж наша жыта ў каласочку,
А нашы дзевачкі ў вяночку.

Гаспадары выносілі і давалі цукеркі, каржы і іншае. Дзеці і моладзь адзяваліся ў цыган і з крапівай хадзілі па сялу, варажылі сустрэчным, за што атрымлівалі пачастунак, а калі не давалі, то таго джыгалі крапівай. Таксама вадзілі мядзведзя. Пасля русалку вялі ў жыта і качалі яе ў жыце. Затым ішлі у пэўнае месца, дзе хлопцы распальвалі касцёр, кідалі ў яго вянок, частаваліся, гулялі, скакалі цераз вогнішча, спявалі песні.

# Жніўныя песні



Ой, крапівушка ты жыгучая,
Ой, свякруха мая дай празлючая была.
Адпраўляла мяне ў поле жыта жаць адну.
А я жала, жала, снапы зносіла,
Снапы зносіла, дзіця бросіла.
І дадому прыйшла, а дзіця не знайшла.

Выпраўляла мяне маці яравое жыта жаці,
А я жыта не жала, у баразёнцы ляжала.
Баразенька вузенька – не памесцілася.
Вон Мікітка ідзе, мне арэшкі нясе
…

Кацілася ясна зорачка,
Ды ўпала дадолу,
Прыйшлы маладая дзяўчыначка
Дай дадому.
Ідзі, ідзі мая дзеўчына
Жыта жаці, жыта жаці,
У снапочкі вязаці.
Жала жыта, жала,
Пану спрыяла, бараду пажала,
Да панны ласку мала.

А чыя ж эта барада
Мёдам,  віном уліта?
Мёдам, віном уліта,
Красным шолкам увіта?
Івана барада мёдам, віном уліта,
Красным шолкам увіта!
Ой, дзіва мне, такой барадзе.

**Дадатак 5. Хрысціянскія святы. “Свяча”**

# " Свяча "



Свята “Свяча”, характэрнае для ўсходняй часткі Беларусі, захавалася ў некаторых нашых вёсках да гэтага часу. Трэба адзначыць, што традыцыя вырабу агульнай вялікай свячы, якая і дала назву свяце, не захавалася. “Свячой” у нашай мясцовасці называюць ікону адпаведнага святога, у гонар якога і адзначаецца гэта свята.

Адзначаецца “Свяча” наступным чынам: вечарам, перад адпаведным святам, сабіраюцца ў тую хату, дзе знаходзіцца ікона-“Свяча”, служыцца малебен, затым ікона пераносіцца ў суседнюю хату. У гэтым падвор’і адкрываюць вароты, ад якіх да хаты сцелюцца палавікі, гаспадыня з хлебам-соллю на варотах сустракае “Свячу”. Тая жанчына. Якае аддае ікону, цалуе яе, забірае хлеб-соль. Ікону ставяць у чырвоны кут і адпраўляюць вячэрнюю службу, утрань і акафіст. Затым адбываецца вячэра, бо кожны з сабой прыносіць што-небудзь з яды, і гэтым доме гаспадыня таксама рыхтуе вячэру.



“Свяча” ў в. Паддабранка на Іаана Златавуста

Назаўтра, у дзень свята, ідуць у царкву, дзе служыцца літургія, адбываецца асвячэнне вады, крэсны ход вакол храма. Затым ідуць у хату, дзе знаходзіцца “Свяча”, служыцца малебен, агульная трапеза, пасля чаго бацюшка ішоў па сялу і асвячаў двары (калі быў аброчны дзень).

На працягу года кожны жыхар вёскі можа прыходзіць у гэтую хату, дзе знаходзіцца “Свяча”, паставіць свячу аброчнаму святому, звярнуцца да яго з просьбай.

“Свяча” адзначаецца ў дзень ушанавання таго святога або падзеі, у гонар якога названа царква ў вёсцы, ці “аброчнага” святога, якому жыхары вёскі абракліся служыць малебен, не працаваць у гэты дзень, дзеля таго, каб ён зберог іх ад нейкай бяды.

У кожнай вёсцы звычайна некалькі разоў за год адзначаецца “Свяча”. У в. Маркавічы на прастольнае свята ў гонар Архангела Міхаіла (тут была царква Архістратыга Міхаіла) і Святога Вялікамучаніка Панцеляймона –

“Панцілімана” – аброчнае свята. У вёсцы захоўваюцца дзве “свячы” Панцеляймона, бо вёска мае вялікую працягласць.



“Свяча” Архангелу Міхаілу



“Свяча” Вялікамучаніку Панцеляймону

У в. Гадзічава на прастольнае ў гонар Святамучаніцы Кацярыны (знаходзіцца царква) і аброчныя святы Марыі Магдаліны і Узнясення.



“Свяча” Узнясенне



“Свяча” Вялікамучаніцы Кацярыны

У п. Рагі Ілецкі “Свяча” адзначалася на Ражаство Хрыстова, у п. Халмы на Абраз Казанскай Божай Маці, у в. Паддабранка “Свяча” ў гонар Іаана Златавуста. У в. Глыбоцкае “Свяча” адзначалася на Ражаство Хрыстова (у гонар царквы), на Крашчэнне і на Абраза Ціхвінскай Божай Маці.

У апошні час “Свяча” не пераносіцца з хаты ў хату, а захоўваецца ў царкве або ў некаторых жыхароў і святкуецца ў гэтай хаце.



“Свяча” Марыя Магдаліна



“Свяча” Абраза Казанскай Божай Маці

**Дадатак 6. Каляндар народных свят і абрадаў в. Маркавічы і наваколля**

# Каляндар народных свят



# в. Маркавічы і наваколля

| | | |
|---|---|---|
| **Зімовыя святы**<br> | **Снежань** | 7 снежня – Кацярына<br>Прастольнае свята ў в. Гадзічава (храмок). “Свяча” ў в. Гадзічава<br>19 снежня – Мікола Зімні |
| | **Студзень** | 7 студзеня – Ражаство Хрыстова<br>Прастольнае свята ў в. Глыбоцкае (храмок). “Свяча” ў в. Глыбоцкае<br>8 студзеня – “Звязда”<br>13 студзеня – Шчодрыкі<br>14 студзеня – Новы год (Васіль)<br>19 студзеня - Крашчэнне |
| | **Люты** | 15 лютага - Стрэчанне<br>Канец лютага – Маслены тыдзень |
| **Вясеннія святы**<br> | **Сакавік** | 22 сакавіка- Сoракі<br>Прошчаная нядзеля |
| | **Красавік** | 7 красавіка – Благавешчанне<br>Гуканне вясны<br>Вербная нядзеля<br>ПАСКА<br>Другі дзень Паскі - Сула<br>Радуніца |
| | **Май** | 6 мая - Юрый<br>22 мая – Мікола Летні<br>Узнясенне.”Свяча” ў Гадзічаве |
| **Летнія святы** | **Чэрвень** | Сёмы тыдзень пасля Паскі - Тройца<br>Трэці дзень Тройцы – асвячэнне вады ў Варварынскай крыніцы |
| | **Ліпень** | 6 ліпеня - Ваджэнне русалкі<br>7 ліпеня - Іван Купала<br>9 ліпеня – вобраза Ціхвінскай Маці Божай. Аброчнае свята |

| | | |
|---|---|---|
| <br>**Летнія святы**<br> | | ў в. Глыбоцкае. “Свяча”<br>12 ліпеня – Пятро |
| | **Жнівень** | 2 жніўня – Ілля<br>4 жніўня – Марыя Магдаліна. Аброчнае свята ў в. Гадзічава. “Свяча”<br>9 жніўня – Панцеляймон. Аброчнае свята ў в. Маркавічы. “Свяча”<br>14 жніўня – Першы (Мядовы) Спас<br>19 жніўня – Другі (Яблычны ) Спас<br>26 жніўня – Ціхан Задонскі. Аброчнае свята ў в. Гадзічава і Маркавічы<br>28 жніўня – Першая Прачыстая<br>(Успенне Багародзіцы)<br>29 жніўня – Трэці (Хлебны) Спас |
| **Асеннія святы**<br> | **Верасень** | 11 верасня – Іван Галавасек<br>19 верасня – “Чуды” Міхайлы<br>21 верасня – Другая Прачыстая<br>(Нараджэнне Багародзіцы) прастольнае свята ў в. Глыбоцкае<br>27 верасня – Здвіжанне. Дзень вызвалення в. Маркавічы |
| | **Кастрычнік** | 14 кастрычніка – Пакрова |
| | **Лістапад** | 2 лістапада – Дзмітраўскія Дзяды<br>21 лістапада – Міхайла прастольнае свята ў в. Маркавічы. “Свяча”<br>26 лістапада – Іаан Златавуст Аброчнае святаў в. Паддабранка. “Свяча” |

# Анатацыя

Мэта дадзенай работы – даследаваць асаблівасці каляндарных свят і абрадаў в. Маркавічы і наваколля, садзейнічаць захаванню і адраджэнню фальклорнай спадчыны Гомельшчыны.

На аснове унікальнага матэрыялу, які збіраўся на працягу 2009-2011 гадоў, у рабоце апісваюцца святы і абрады в. Маркавічы і навакольных вёсак, якія уваходзяць у склад Маркавіцкага сельскага савета Гомельскага раёна. У дадзенай рабоце сабраны матэрыял аб асноўных хрысціянскіх і язычніцкіх святах і абрадах мясцовасці, звесткі аб якіх захаваліся да нашага часу, даецца характарыстыка і аналіз фальклорнай спадчыны рэгіёна. Падрабязна апісаны такія абрады, як “Звязда”, “Сула”, “Гуканне вясны”, “Ваджэнне русалкі”, “Свяча”, сабраны шчадроўныя, валачобныя і жніўныя песні. Таксама разглядаецца сучасны стан бытавання каляндарных свят і абрадаў мясцовасці. Адзначаецца, што унікальнасць і багацце фальклорнай спадчыны в. Маркавічы і наваколля дазваляе выкарыстоўваць яе для развіцця этнатурызму.

На аснове фальклорнай спадчыны в. Маркавічы і наваколля створаны каляндар народных свят і абрадаў, які прадстаўлены ў дадатку.

Работа насычана багатым ілюстрацыйным матэрыялам.